**Карына Бадылевіч** (*Мінск*)

# ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ ПЯТРА МІРОНАВІЧА МАШЭРАВА Ў ФОНДАХ ЛІТАРАТУРНАГА МУЗЕЯ ПЕТРУСЯ БРОЎКІ

У фондах Літаратурнага музея Петруся Броўкі захоўваюцца дакументальныя матэрыялы, якія маюць дачыненне да асобы Пятра Міронавіча Машэрава, першага сакратара Цэнтральнага камітэта Камуністычнай партыі Беларусі (далей – ЦК КПБ).

Гэтых двух людзей – Петруся Броўку і Пятра Машэрава – звязвала і доўгая праца над адным з самых маштабных культурных праектаў краіны, і доўгае, шчырае сяброўства.

---

[1] Сакович В. С. Сельское хозяйство Беларуси в цифрах 1980–2007 гг. … С. 33, 36, 42.

[2] Народное хозяйство Белорусской ССР : стат. ежегодник. С. 94.

Абодва – талантлівыя арганізатары, яны паклапаціліся аб развіцці энцыклапедычнай справы ў Беларусі. Класік беларускай літаратуры і кіраўнік рэспублікі змаглі аб'яднаць вялікую колькасць людзей для стварэння першай беларускай энцыклапедыі – БелСЭ.

Асабісты ўдзел Пятра Міронавіча Машэрава ў справе БелСЭ вялікі. Алесь Петрашкевіч, які працаваў у той час, калі ўсё пачыналася, загадчыкам сектара літаратуры ЦК КПБ, расказаў ва ўспамінах пра Петруся Броўку, што менавіта Пётр Міронавіч Машэраў прапанаваў паэту стаць галоўным рэдактарам будучай Беларускай энцыклапедыі[1]. Пётр Машэраў даў Петрусю Броўку некалькі дзён, каб прыняць рашэнне. Але было відавочна, што ён пагодзіцца, бо Пётр Усцінавіч даволі часта пераказваў знаёмым словы, якія пачуў на Генеральнай Асамблеі ААН у Нью-Ёрку: «Цывілізаваным лічыцца толькі той народ, які мае свой флаг, герб і энцыклапедыю»[2].

Выданне энцыклапедыі не атрымалася б без падтрымкі на самым высокім дзяржаўным узроўні. Усе пытанні вырашаліся ў ЦК КПБ з удзелам першых асоб краіны. Яшчэ калі Пётр Машэраў праводзіў першую нараду па справах энцыклапедыі ў зале пленумаў, ён заявіў, каб усе прысутныя лічылі БелСЭ органам ЦК КПБ (хоць насамрэч яна была створана як даследчы інстытут у сістэме Акадэміі навук). Аднак пасады галоўнага рэдактара, адказнага сакратара і склад рэдакцыйнай калегіі ўключаліся ў наменклатуру ЦК КПБ[3].

У пачатку сваёй дзейнасці на пасадзе галоўнага рэдактара П. Броўка накіраваў у Савет Міністраў БССР ліст, дзе пералічыў тое, што трэба зрабіць па вывучэнні гісторыі помнікаў культуры, этнаграфіі, беларускай мовы, прыроды краіны[4]. Паэт вёў наконт гэтага перапіску і з П. Машэравым. Так, у Цхалтуба, дзе аднойчы адпачывалі П. Броўка і І. Шамякін, Пётр Усцінавіч паказаў сябру ліст на імя Машэрава. У ім П. Броўка пісаў аб працы будаўнікоў, паляпшэнні іх побыту і ўшанаванні іх працы ў літаратуры і кіно. Паэт нават прапанаваў кіраўніку рэспублікі пасадзейнічаць стварэнню ў Мінску помніка будаўнікам, якія займаліся аднаўленнем сталіцы і гарадоў Беларусі пасля вайны[5].

---

[1] Петрашкевіч А. Чалавек вялікай душы // Успаміны пра Петруся Броўку / склад. Р. В. Шкраба. Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. С. 261–262.

[2] Там жа. С. 261.

[3] Пашкоў Г. Метадалагічна-арганізацыйныя традыцыі Петруся Броўкі ў працы «Беларускай энцыклапедыі» // Пятрусь Броўка і яго час : матэрыялы Рэсп. навук. канф., Мінск, 24 чэрв. 2005 г. / Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы ; адказ. рэд. С. С. Лаўшук. Мінск : Інстытут літаратуры імя Я. Купалы НАН Беларусі, 2005. С. 96.

[4] Шамякін І. Свая нялёгкая дарога / І. Шамякін // Успаміны пра Петруся Броўку / склад. Р. В. Шкраба. Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. С. 151.

[5] Там жа. С. 152.

Здараліся і кур'ёзныя выпадкі, якія не мог перадумовіць ніхто. У пачатку свайго існавання рэдакцыя БелСЭ знаходзілася ў памяшканнях Акадэміі навук (бо не мела ўласнага будынку, а штат быў вялікі). Аднойчы намеснік управляючага справамі Акадэміі навук абрэзаў і забраў тэлефон галоўнага рэдактара П. Броўкі, і П. Машэраў не змог з ім звязацца. Петрусю Усцінавічу прыйшлося пра гэта расказаць і, «пасмяяўшыся, Пётр Міронавіч сказаў: "Я табе, Пётр Усцінавіч, такі тэлефон пастаўлю, што да яго ніхто дакрануцца не пасмее"»[1]. Калі ж рэдакцыя БелСЭ пераехала ва ўласны будынак, Машэраў спецыяльна завітаў да працаўнікоў энцыклапедыі, каб паглядзець, ці добра яны ўладкаваліся[2].

У 1975 г. завяршылася выданне Беларускай Савецкай энцыклапедыі, і ў тым жа годзе галоўны яе рэдактар адзначыў 70-годдзе. Энцыклапедыя стала галоўным падарункам юбіляру. Дзякуючы намаганням П. Броўкі і згодна рашэнню ўрада, рэдакцыя БелСЭ была захавана ў тым жа выглядзе і аб'ёме пасля заканчэння выхаду энцыклапедыі. Створаны і выхаваны галоўным рэдактарам калектыў быў замацаваны за выдавецтвам і працягваў плённую навуковую справу далей. Іван Шамякін успамінаў, як аднойчы П. Броўка паказаў «праект пісьма ў ЦК КПБ з прапановамі аб далейшай дзейнасці БелСЭ»[3]. Праект быў ухвалены П. Машэравым.

Пятрусь Броўка і Пётр Машэраў вельмі паважалі адзін аднаго. Пётр Усцінавіч называў яго нацыяльным героем[4], а Пётр Міронавіч высока цаніў творчасць і асобу паэта, пастаянна згадваючы яго ў выступленнях і артыкулах. Рыгор Барадулін прыгадаў словы Пятра Усцінавіча, сказаныя пасля выступлення П. Машэрава на пленуме ЦК КПБ: «Хоць ушацкія і не любяць хваліцца, але я шчаслівы і горды па-сапраўднаму»[5]. У гэты час П. Броўка цяжка хварэў, таму шчырыя словы Пятра Міронавіча ўзрадавалі паэта. П. Машэраў непакоіўся пра здароўе Петруся Усцінавіча, дасылаў яму тэлеграмы і лісты.

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы